Штомесячны навукова-тэарэтычны і інфармацыйна-метадычны часопіс

Выдаецца са студзеня 1992 года

АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

10 (34) 1994

# АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ

## Образование и воспитание
*
## Education and upbringing
*
## Bildung und Erziehung

Заснавальнікі —
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Нацыянальны інстытут
адукацыі

Калектыў рэдакцыі
часопіса
"Адукацыя і выхаванне"

Галоўны рэдактар
**У.П.Пархоменка**

Рэдакцыйная калегія
І.П.Гракові̇ч
Р.Я.Грынкевіч
Н.Ю.Зайцава
(намеснік галоўнага рэдактара)
Г.Р.Клябанаў
М.І.Латыш
Я.А.Пастушэнка
І.І.Паўлоўскі
Л.А.Пергаменшчык
В.І.Стражаў
М.А.Супрановіч
(адказны сакратар)
І.А.Фурманаў
Г.У.Швяцова

Мінск
1994

Хронiка

# Успамiн пра будучыню

Псiхолагi, якiя даследуюць уздзеянне чарнобыльскай катастрофы на асобаснае развiццё дарослых i дзяцей, зафiксавалi у пацярпеушых феномен, названы "эффектом укороченного будущего" (АiВ — 1993. — №2). Назва дадзенай з'явы прыйшла з тэорыi посттраўматычнага стрэсавага расстройства, у якой сцвярджаецца, што калi чалавек атрымау псiхатрауму, то яму нялёгка уявiць будучыню, ён жыве у мiнулым. У посттраўматычнай сучаснасцi яму складана адчуць радасць, паунату шчасця, яго магчымасцi у творчасцi абмежаваны. Нармальнае ж развiццё чалавека, асаблiва дзiцяцi, немагчыма без мар, будучынi, у якой павiнна быць лепш чым у сучаснасцi.

Спецыялiсты, што працуюць па праграме "Сацыяльна-псiхалагiчная рэабiлiтацыя i сацыяльна-прававая абарона дзяцей i падлеткаў" у вынiку рэгулярных семiнараў-трэнiнгаў авалодалi тэхнiкай работы па фармаваннi асобы, па праектаваннi i планаваннi будучынi.

Цэнтр псiхолага-педагагiчных праблем Чарнобыля Нацыянальнага iнстытута адукацыi 18—20 чэрвеня правёу чарговы семiнар (праводзiць штомесячныя семiнары са спецыялiстамi, якiя працуюць у кансультацыйных цэнтрах i пунктах) у г.п. Брагiн. Яго асаблiвасць заключаецца у тым, што, акрамя псiхолагаў-кансультантаў з Гомеля, Рэчыцы, Мiнска, Брагiна, у iм удзельнiчалi настаунiкi, бацькi iх дзяцей—жыхары Брагiна. Усяго у семiнары прынялi удзел каля 40 чалавек.

Састаў удзельнiкаў вызначыў i мэты семiнара: практычная — дапамога людзям у пераадоленнi псiхалагiчных праблем i вучэбная — прадаўжэнне навучання спецыялiстаў, якiя працуюць у рэгiянальных цэнтрах псiхалагiчнай дапамогi.

Ролю трэнера i псiхолага-кансультанта выконвала на гэты раз псiхолаг з Масквы Я.М.Чарапанава, якая вядзе пастаянную вучэбную групу у тэхнiцы псiхадрамы з беларускiмi псiхолагамi.

Адначасова з iмi па запрашэннi Нацыянальнага iнстытута адукацыi у семiнары удзельнiчалi супрацоўнiкi Шведскага тэлебачання Рык Васэрман i Родгер Эдберг. Мэта iх прыезду — убачыць, зразумець, па магчымасцi зрабiць здымкi i паглядзець, як працуюць тут псiхолагi.

Работа семiнара (падрабязнасцi яго правядзення, рэакцыя удзельнiкау i эфектыунасць праводзiмых працэдур — гэта тэма для сур'ёзнай размовы) выявiла асноуныя праблемы жыхароу Брагiна — трывогу за будучыню, хваляванне за здароуе дзяцей i сваё.

Семiнар заканчвауся, i у людзей разгладжвалiся маршчыны, святлелi твары, высыхалi слёзы.

Людзi былi рады гасцям з Масквы, Стакгольма, Мiнска i некалькi здзiулены, што да iх прыехалi не з гуманiтарнай дапамогай (да гэтага ужо прывыклi), а для таго, каб даведацца, якiя праблемы iх хвалююць, як яны з iмi спрауляюцца.

Здзiуленне i задавальненне выклiкала праца швецкiх тэлевiзiёншчыкау—яны шчыравалi з сямi гадзiн ранiцы i пакуль свяцiла сонца, i хоць не ведалi яны мовы (перакладала Чарапанава), але гугарылi лёгка, праз хвiлiну самая пераборлiвая бабулька згаджалася iм пазiраваць. Якiм чынам без слоу яны унушалi давер? Прафесiйная тайна.

З "падарожжа" па Брагiну i Брагiнскiм раёне можна зрабiць такiя вывады:

1. Людзi, якiя жывуць у iм, заслугоуваюць павагi, а не жалю. Палiтыка дзяржавы павiнна быць накiравана на стварэнне умоу, калi людзi самi вырашаюць свой лёс, i не трэба адкуплiвацца ад iх гуманiтарнымi падачкамi — гэта разбэшчвае.

2. Сярод чатырох узроставых груп, з якiмi працавалi псiхолагi (дзецi, моладзь, дарослыя i старыя), больш пiльнай увагi патрабуюць людзi пажылога узросту. Вынiкi сацыядрамы паказалi, што самая змрочная будучыня у старых. Для iх яна — у дзецях, унуках, а тыя выязджаюць. Калi хочам, каб дзецi выраслi сапраўднымi людзьмi, каб не перарвалася сувязь пакаленняў — неабходна дзяржауная i недзяржауная падтрымка гэтай узроставай групы. Патрабуецца праграма "Старыя Чарнобыля".

3. Выкананне праграмы "Сацыяльна-псiхалагiчная рэабiлiтацыя i сацыяльна-прававая абарона дзяцей i падлеткаў" дазволiла выхаваць добрыя кадры спецыялiстаў-псiхолагаў у Гомелi, Рэчыцы, Мазыры, Мiнску, Астрауцы. Сярод iх — Сяргей Жарабцоу, Святлана Ганчарова, Сяргей Крысенка, Аксана Капба, Святлана Бацюлева i iнш. Калi да гэтых псiхолагау звяртаюцца людзi за дапамогай, можна быць упэуненым, што квалiфiкаваная дапамога будзе аказана.

**Л. А. Пергаменшчык,** *кандыдат псiхалагiчных навук*